# НА МІНШЧЫНЕ СЯРОД НАЙЛЕПШЫХ — НЯСВІЖСКІ РАЁН

## Ёсць і двухтысячнікі

**Мінская вобласць — лідар па тэмпе ўборачнай кампаніі. Пра гэта заявіў першы намеснік старшыні Мінскага аблвыканкама Васіль СЫСОЕЎ.**

«97 працэнтаў камбайнаў ужо ў палях, — расказаў прадстаўнік абласной вертыкалі. — Уся збожжаўборачная тэхніка прайшла тэхнічны агляд. Працуюць сушылкі. Спадзяёмся, што будзем іх задзейнічаць менш. Усе арганізацыйныя пытанні на месцах вырашаны. Людзі, якія павінны былі прыбыць для правядзення ўборачных работ, асабліва камбайнеры, ужо ў палях. Масавая ўборка чакаецца на наступным тыдні».

Тэмп кампаніі задала ўборка азімага ячменю, якая ўжо завершана. Атрымана ўраджайнасць 41,8 цэнтнера з гектара. «Намалочана гэтай культуры роўна ў два разы больш, чым летась, — 260 тысяч тон. Агульны намалот — крыху больш за 300 тысяч тон, ільвіная доля — азімы ячмень. Уборка, на жаль, пакуль не выйшла на запланаваныя пяць працэнтаў, таму што частка рэгіёнаў з-за фізіялагічнай негатоўнасці палёў да масавай уборкі яшчэ не прыступіла», — дадаў Васіль Сысоеў.

Восем раёнаў, пачынаючы з паўднёвых (Нясвіжскі, Салігорскі, Слуцкі і іншыя), ужо вядуць масавую ўборку. У асноўным убіраецца азімы рапс, пасяўная плошча якога — больш за 94 тысячы гектараў. Палова ўжо прыбраная. На наступным тыдні чакаецца завяршэнне работ. «Атрымана ўраджайнасць 28 цэнтнераў з гектара, але яна з кожным днём расце. Лепшыя палі наперадзе», — заўважыў першы намеснік старшыні аблвыканкама.


Фота ТК «Клецк/Навіны».

Дзве тысячы тон збожжа першым у Беларусі перавёз малады вадзіцель з Клецкага раёна Андрэй АЛЯКСЕЙЧЫК.

На ўборачнай у лідарах Нясвіжскі раён, дзе па азімым ячмені атрымана ўраджайнасць 72 цэнтнеры з гектара, і пры ўборцы збожжа яна не зніжаецца. На другім месцы — Дзяржынскі раён. «Сёння разгортваецца Мінск, чакаем, што падцягнуцца і Смалявічы, дзе будзе ўраджайнасць звыш 60 цэнтнераў з гектара», — адзначыў Васіль Сысоеў.

У цэнтральным рэгіёне з'явіўся першы двухтысячнік на перавозцы збожжа. Ім стаў прадстаўнік Клецкага раёна — малады кіроўца з ААТ «Кухчыцы» Андрэй Аляксейчык. Ён, дарэчы, стаў першым, хто перавёз 2000 тон зерня, не толькі ў вобласці, але і ў Беларусі. У найбліжэйшы час падобны вынік атрымаюць і камбайнерскія экіпажы Міншчыны.

Васіль Сысоеў распавёў пра сітуацыю на палях пасля разгулу стыхіі. «Папярэдні вынік: гібелі таго, што вырасла, няма. Будзе палегліца каля шасці тысяч гектараў. Але нашы хлебаробы ўмеюць прыбіраць палеглыя хлябы, не бачым тут праблем. Ёсць сцяблопад'ёмнікі, тэхналогія ўборкі, якая дазволіць захаваць ураджай. Галоўнае, каб не зараслі палі пустазеллем другой хвалі, калі будуць працягліся дажджы. Але такіх не прадбачыцца. Сур'ёзных карэктыў надвор'е нам не ўнесла. Працуем у планавым рэжыме. Наступны тыдзень — выхад на масавую ўборку, каб на працягу двух тыдняў яе завяршыць», — рэзюмаваў ён.

Гэтымі днямі старшыня Мінскага абласнога выканаўчага камітэта Аляксандр Турчын правёў селектарную нараду з удзелам старшынь райвыканкамаў, дзе разглядаліся пытанні жніва, у тым ліку арганізацыя харчавання, наяўнасць спецадзення, выкананне графікаў работ.

Адметнасць сёлетняй кампаніі ў тым, што ўборка пачалася раней. «Нас гэта радуе, таму што асноўным відам работ на жнівень бачым не ўборку, а пасеў азімага рапсу, да якога плануем прыступіць 25 ліпеня. Для гэтага ўжо 10 працэнтаў плошчаў узарана. Сёння асноўная ўвага аддаецца такой тэхналагічнай аперацыі, як уборка саломы. Гэта вельмі важна: неабходна вызваліць плошчы пад ураджай наступнага года», — дадаў Васіль Сысоеў.

На 16 ліпеня аграрыі Мінскай вобласці з улікам рапсу сабралі больш за 465 тысяч тон збожжа. Паралельна з уборкай ідзе церабленне лёну. Выцераблена 2,65 тысячы гектараў (30,6 працэнта плошчаў, якія падлягаюць уборцы). Працягваюцца работы па нарыхтоўцы травяных кармоў. Усяго нарыхтавана 771 тысяча тон кармавых адзінак (34,8 працэнта да плана).

**Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ.**

# ПАМЁР МІКАЛАЙ ДАМАШКЕВІЧ



Мікалай Фёдаравіч Дамашкевіч крыху не дажыў да свайго 75-годдзя. Ён нарадзіўся ў 1949 годзе ў Жыткавіцкім раёне. Працоўны шлях пачынаў як аўтаслесар меліярацыйнай арганізацыі, пасля скончыў Магілёўскі машынабудаўнічы інстытут, працаваў па спецыяльнасці «Інжынер-механік». Пазней займаў шэраг кіруючых пастоў у дзяржаўных органах улады. Быў начальнікам Службы кантролю Прэзідэнта Беларусі, старшынёй Камітэта дзяржкантролю. Доўгі час быў кіраўніком Мінскай вобласці. На пасадзе старшыні Мінскага аблвыканкама Мікалай Фёдаравіч быў уважлівым чытачом і добрым сябрам нашай газеты. Ні адна крытычная публікацыя, якая датычылася Міншчыны, не засталася без яго асабістай увагі.

Пасля Мікалай Дамашкевіч працаваў на пасадзе кіраўніка спраў Прэзідэнта, памочнікам Прэзідэнта — галоўным інспектарам па Віцебскай вобласці аж да сыходу ў адстаўку.

Быў дэпутатам Вярхоўнага Савета Беларусі, членам Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу.

**«Жыццёвы шлях Мікалая Фёдаравіча з'яўляецца прыкладам беззапаветнага і адданага служэння народу і Айчыне. Маштаб асобы, дзяржаўнае мысленне, цвёрды характар, патрабавальныя адносіны да справы і актыўная грамадзянская пазіцыя заўсёды складалі аснову высокіх вынікаў на самых адказных участках яго прафесійнай дзейнасці. Прытрымліваючыся прынцыпаў абавязку і гонару, ён унёс значны ўклад у стварэнне эфектыўнай сістэмы дзяржаўнага кіравання», — гаворыцца ў спачуванні, якое Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка накіраваў родным і блізкім выдатнага дзяржаўнага дзеяча Беларусі, вопытнага і аўтарытэтнага кіраўніка. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што светлая памяць пра вернага сына Беларусі захаваецца ў гісторыі краіны і сэрцах саратнікаў Мікалая Дамашкевіча.**

**Члены Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокія спачуванні родным і блізкім Мікалая Фёдаравіча ДАМАШКЕВІЧА, былога члена Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь другога і трэцяга скліканняў, старшыні Мінскага абласнога выканаўчага камітэта, кіраўніка спраў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, памочніка Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь — галоўнага інспектара па Віцебскай вобласці, у сувязі з яго смерцю.**

**Смуткуем і падзяляем горыч гэтай незамennай страты.**

**Светлая памяць пра Мікалая Фёдаравіча назаўсёды захаваецца ў нашых сэрцах.**

**Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь смуткуюць у сувязі са смерцю выдатнага дзяржаўнага дзеяча Мікалая Фёдаравіча ДАМАШКЕВІЧА і выказваюць глыбокія спачуванні яго родным і блізкім.**

# УЛАДАРЫ ХЛЕБНАЙ НІВЫ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Сёлетняя ўборачная кампанія пачалася раней, чым летась. Азімыя культуры саспелі значна хутчэй, цяпер усе намаганні скіраваны на тое, каб своечасова ўраджай з палёў сабраць. Таму тэхніка ў полі з дзевяці ранку і да самага вечара, пакуль не ўпадзе раса. Планку мінулага года тут трымаюць упэўнена, зараз намалоты па гаспадарцы складаюць больш за 98 ц/га.

Асноўныя рызыкі зноў жа звязаны з надвор'ем. Спякота яшчэ і падганяе хлебаробаў. Гэта пара хуткага рэагавання. Памарудзіш, і могуць быць страты — рапс палушчыцца, зерне асыпецца. Камбайнеры таксама ўважліва сочаць за тым, каб не дапускаць страт.

Па словах Андрэя Савіцкага, які за штурвалам ужо пяты сезон, трэба кантраляваць хуткасць, не спяшацца, каб ішоў добры абмалот, зерне не заставалася ў саломе. Для гэтых мэт у кабіне ўсталяваны спецыяльныя электронныя датчыкі. Дарэчы, хуткасць камбайна невялікая — да 3 км/г. Разганяцца тут не рэкамендуецца. Увогуле ўмовы для работы камфортныя, кажа механізатар. Сам ён мясцовы, раней працаваў будаўніком, але вырашыў сесці за камбайн, аб чым зусім не шкадуе. Атрымаў жыллё. Заробкі таксама добрыя, неаднаразова быў у ліку тысячнікаў на жніве. Вось і сёлета мяркуе хутка ўзяць гэту планку. Дарэчы, у СВК «Прагрэс-Верцялішкі» ёсць першы камбайнер-тысячнік — Валерый Савасцян — хлебароб з салідным стажам.

А ўсяго ў Гродзенскай вобласці на раніцу 17 ліпеня 24 камбайнеры пераадолелі тысячны рубеж па намалоце зерня.

У сераду адбыўся новы рэкорд. Планку ў дзве тысячы тон узяў камбайнер Гродзенскага раёна Сяргей Шантыр. Ён, дарэчы, быў першым тысячнікам у вобласці. І вось праз два тыдні — першы двухтысячнік. Хлебароб працуе ўжо 24-ы сезон, стартаваў калісьці на «Ніве» і «Доне», працаваў у некалькіх гаспадарках раёна, 14 гадоў шчыруе на палях СВК «Гродзенскі».

Трэба сказаць, што вопытны хлебароб штогод у лідарах жніва. Летась ён наблізіўся да пяцітысячнага рубяжа. У гаспадарцы ўпэўнены, што ён і сёлета свайго не ўпусціць. Ужо пайшоў у значны адрыў ад сваіх калег. Гэтым самым задае тэмп і іншым механізатарам. Рэкордных намалотаў яму ўдалося дасягнуць на азімым ячмені, ураджайнасць якога ў СВК «Гродзенскі» дасягнула 102 цэнтнеры з гектара. Намалот дадзенай культуры ў гаспадарцы — больш за тысячу тон. А сярэдняя ўраджайнасць па гаспадарцы складае без малога 100 ц/га. Сельгаспрадпрыемства ў ліку першых па жніве ў Гродзенскім раёне і вобласці.

Менавіта высокая ўраджайнасць, па словах Сяргея Шантыра, садзейнічала яго перамогам. Да таго ж, справа на жніве яму добра вядомая, таму ўсё ідзе сваім парадкам. Камбайнер не хоча загадваць наперад, але разлічвае на добры вынік. Выдатна ведае сваю тэхніку, асаблівасці палёў, улічвае і фактар надвор'я. А галоўнае — верыць у свае сілы і вопыт.

Трэба сказаць, што ўборачная кампанія дае магчымасці добра зарабіць. Як расказаў старшыня Гродзенскага абкама прафсаюзаў АПК Рамуальд Юроўскі, за дзень заробак у камбайнера можа скласці 450-500 рублёў у залежнасці ад намалоту. Таму ў прастоях ніхто не зацікаўлены. Калі тона каштуе 2 рублі, то за бункер у 6 тон можна атрымаць 12. А такіх бункераў за дзень набягае не адзін дзесятак. Працаваць камбайнерам камфортна, зазначае прадстаўнік прафсаюза. Усе камбайны і большасць аўтамашын абсталяваны кандыцыянерамі, усім даецца спецадзенне, паўсюль работнікі на жніве забяспечаны гарачым харчаваннем два разы на дзень. Выдаткі на абед і вячэру большасць гаспадарак поўнасцю бярэ на сябе, а там, дзе яны платныя, на долю работніка прыходзіцца толькі 1,5-2 рублі даплаты. Раздатачны аўтамабіль абсталяваны столікамі, рукамыйнікам, аднаразовымі ручнікамі. Кожнаму работніку даецца вада ў бутлях. Сёлета прафсаюзы ўвялі новую паслугу — на палі выязджаюць работнікі ФАПаў, каб упэўніцца, што ўсе знаходзяцца ў добрым стане, асабліва ва ўмовах спякоты. Па словах прадстаўніка прафсаюза, кіраўнікі гаспадарак і самі вельмі ўважліва ставяцца да сваіх кадраў, асабліва тых, хто працуе на жніве.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Якасць паветра алімпійскіх аб'ектаў у Францыі не адпавядае нормам СААЗ



Якасць паветра ў зоне алімпійскіх аб'ектаў у Францыі не адпавядае стандартам Сусветнай арганізацыі аховы здароўя (СААЗ). Аб гэтым паведаміла ТАСС са спасылкай на справаздачу французскай экалагічнай асацыяцыі Respire. Большая частка спартыўных аб'ектаў размешчана побач з Парыжскай кальцавой аўтадарогай, дзе зафіксаваны павышаныя выкіды дыяксіду азоту. «Заняткі спортам пры такім стане паветра небяспечныя для здароўя», — падкрэсліваецца ў справаздачы Respire. Раней эксперты таксама прызналі нездавальняючай якасць вады ў Сене, дзе запланавана правядзенне шэрагу спаборніцтваў па плаванні.

### Энергасістэмы Еўропы не спраўляюцца з нагрузкай з-за анамальнай спякоты

Небывалая спякота ўсталявалася ў шэрагу рэгіёнаў Еўропы, у некаторых дзяржавах слупок тэрмометра падняўся да адзнакі 40 °C. Энергасістэмы Еўропы не спраўляюцца з нагрузкай, паведаміў Euronews. Экстранныя службы Румыніі перагружаны вялікай колькасцю выклікаў з-за моцнай спякоты. Улады аб'явілі чырвоны ўзровень небяспекі надвор'я. Тэмпература ў некаторых раёнах дасягае 40 °C у цені. Хуткасць руху цягнікоў і аўтамабіляў на трасах абмежавана. Анамальная спякота таксама стварае нагрузку на энергасістэму. Вытворчасць не паспявае за спажываннем, таму, да прыкладу, перабоі ў падачы электраэнергіі ў Румыніі адбываюцца ўсё часцей. З-за аварыйных адключэнняў электрычнасці кандыцыянеры не працуюць, адзначае Euronews. Акрамя таго, працягваюць бушаваць лясныя пажары ў паўднёвай і цэнтральнай частках Паўночнай Македоніі.